У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі праблема санітарнага стану гарадоў не атрымала належнага навуковага асвятлення. У асноўным гэта пытанне разглядаецца ў рамках даследвання сістэмы медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Усе навукоўцы прыходзяць да высновы, што населеныя пункты Заходняй Беларусі знаходзіліся ў крытычным стане і на працягу ўсяго міжваеннага перыяду гэта была вострая праблема мясцовых улад.


1. Абраменко, М. Е. Здравоохранение в Западной Беларуси / М. Е. Абраменко // Актуальные проблемы медицины: сборник научных статей Республиканской научно-практической конференции с международным участием (Гомель, 11 ноября 2021 года): в 3 т. / И. О. Стома [и др.]. – Гомель : ГомГМУ, 2021. – Т. 2. – С. 91–94.
2. Вайцешчык, Г.С. Матэрыяльны дабрабыт насельніцтва мястэчак Заходняй Беларусі ў 1921– 1939 гг. / Г. С. Вайцешчык // Веснік ГрДУ. – 2013. – № 1 (144). – С. 32–44, 21.
3. Гуралюк, М. Мероприятия по профилактике и борьбе с инфекционными заболеваниями на территории Полесского воеводства в 1921–1939 годах / М. Гуралюк // Архівы і справаводства: навукова-практычны ілюстраваны часопіс. – 2020. – № 3. – С. 102–106.
4. Даркович, А. Л. Городское самоуправление на западно-белорусских землях межвоенной Польши (1919–1939 гг.): диссертация ... кандидата исторических наук: 07.00.03 / А. Л. Даркович. – Москва, 2017. – 280 л.
5. Даркович, А. Л. Поддержание санитарии и благоустройство в городах на западнобелорусских землях (1919–1939 гг.) / А. Л. Даркович // Журнал региональной истории. – 2017. – № 1. – С. 72–89.
6. Игнатович, Ф. И. Вопросы гигиены и эпидемиологии в работе съездов врачей Западной Беларуси (1920–1939 гг.) / Ф. И. Игнатович, Е. М. Тищенко // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця Заходняга рэгіена Беларусі : матэрыялы Міжнароднай навук.-практ. канф., Брэст, 23–24 красавіка 1998 г. : у 2. – Ч. ІІ. / Брэсцкі джяржаўны універсітэт ; рэд.: С. В. Арцёменка [і інш.]. – Брэст : Выдавецтва С. Лащрова, 1998. – С. 157–162.
7. Капліеў, А. А. Асаблівасці аховы здароўя Заходняй Беларусі ў складзе Другой Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / А. А. Капліеў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 8. – С. 29–37.
8. Касяноўская, Г. С. Сістэма медыцынскага абслугоўвання насельніцтва мястэчак Заходняй Беларусі / Г. С. Касяноўская // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей, УО «Полесский государственный университет», Пинск, 25 февраля 2022 г. / Министерство образования Республики Беларусь [и др.] ; редкол.: В. И. Дунай [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2022. – Вып. 7. – С. 271–276.
9. Могилевчик, З. К. О санитарно-эпидемическом состоянии Западной Белоруссии и вытекающих отсюда первоочередных мероприятиях / З. К. Могилевчик // Медицинский журнал БССР. – 1939. – №12. – С. 95–100.
10. Тищенко, Е. М. Борьба с заразными и социальными болезнями в Западной Беларуси в межвоенный период / Е. М. Тищенко // Совершенствование осуществления государственного санитарного надзора в Республике Беларусь : материалы XI съезда гигиенистов и эпидемиологов РБ, Минск, 16 ноября 2007 г. / редкол.: М. И. Римжа [и др.]. – Минск, 2007. – С. 22–27.
11. Тищенко, Е. М. Здравоохранение Беларуси в XIX–XX вв // Е. М. Тищенко. – Гродно : Гродненский государственный медицинский университет, 2003. – 269 с.
12. Тищенко, Е. М. Здравоохранение Новогрудского воеводства в 1920-е годы / Е. М. Тищенко, А. Фелхнер // Медицина Беларуси XX века : тезисы докладов Восьмой республиканской научной конференции по истории медицины, Витебск, 29–30 октября 1998 г. / под ред. Э. А. Вальчука. – Минск., 1998. – С. 152–154.
13. Тищенко, Е. М. Из истории борьбы с социальными болезнями в Западной Беларуси в межвоенный период (1921–1939) / Е. М. Тищенко, Г. И. Заборовский // Актуальные проблемы пенитенциарной медицины : социально значимые болезни, ВИЧ/СПИД в местах лишения свободы : материалы 2-ой Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 27–28 ноября 2003 г. / КИН МВД Республики Беларусь ; редкол.: Э. А. Вальчук [и др.]. – Минск : Тесей, 2003. – С. 224–226.
14. Тищенко, Е. М. История здравоохранения Белоруссии в XX веке: диссертация ... доктора медицинских наук: 07.00.10 / Е. М. Тищенко. – Москва, 2001. – 461 л.
15. Тищенко, Е. М. Санитарная организация Западной Белоруссии в межвоенный период (1921–1939) / Е. М. Тищенко // Экологопрофилактические проблемы здоровья населения: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 14–15 ноября 2002 г. – Гродно, 2002. – С. 321–322.


**Дрожжа Л.Ч.**

## ВЫНІКІ МЮНХЕНСКАГА ДАГАВОРА 30 ВЕРАСНЯ 1938 Г. У ПЕРАДВАЕННАЙ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ 1960-Х – 2000-Х ГГ.)

У гісторыі перадваеннага палітычнага крызіса адной з самых жахлівых і ганебных для еўрапейскіх дэмакратый падзей з’явілася Мюнхенскае пагадненне 30 верасня 1938 г., якое гісторыкі мінулага стагоддзя акрэслілі як праяву палітыкі здрадніцтва саюзным абавязкам і «замірэння агрэсара» («policy of appeasement»). Фактычна пасля Мюнхена лёс Еўропы на шляху да Другой сусветнай вайны быў вырашаны.

На падставе асабістага аналізу аўтарам польскай гістарыяграфіі другой паловы XX ст. магчыма вылучыць тры перыяды ў вывучэнні праблематыкі Мюнхенскага зговару польскімі гісторыкамі [1, с. 59]:

1) гістарыяграфія першага перыяда – канец 1930-х – 1970-я гг., калі вывучалася польская эмігранцкая і еўрапейская гістарыяграфія, крыніцы і мемуарная літаратура, выдадзеныя за мяжой (Чэхаславакіі, Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША і інш.);

2) гістарыяграфія другога перыяда – канец 1970-х – 1980-я гг., калі ў рэчышчы марксісцкай метадалогіі і прынцыпаў сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў рэцэнзуемых навуковых і перыядычных выданнях вывучалася антысавецкая знешнепалітычная накіраванасць урада II Рэчы

Паспалітай, зрыў сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе, садзейнічанне агрэсіўнай палітыцы Германіі да 1938 г. ў якасці яе сатэліта. Вывучаліся надрукаваныя ў СССР і еўрапейскіх сацыялістычных краінах адкрытыя крыніцы па азначанай праблематыцы;

3) гістарыяграфія трэцяга перыяда – 1990-я – 2000-я гг. – вывучэнне навуковай, перыядычнай і мемуарнай літаратуры, публіцыстыцы, раней закрытых крыніц, выдадзеных у Польшчы і за мяжой. Рэвізія з пункту гледжання тэорыі неапазітывізму папярэдняй канцэпцыі знешнепалітычнай дзейнасці кіраўніцтва ІІ Рэчы Паспалітай («policy of iquilibrium» – «палітыкі раўнавагі»), апраўданне яе палітычнага фіаска.

Неабходна адзначыць, што праблематыка Мюнхенскага крызісу 1938 г. у польскай гістарыяграфіі другой паловы мінулага стагоддзя прадстаўлена шматлікімі даследаваннямі польскіх гісторыкаў, якія вывучалі палітычную гісторыю ІІ Рэчы Паспалітай.

Кропкай адліку значнага пагаршэння адносін паміж Польшчай і Германіяй з-за іх усходняга суседа Чэхаславакіі яны лічаць пачатак 1930-х гадоў. Гісторыкі падкрэсліваюць, што памылка Пілсудскага была ў тым, што з 1926 па 1932 гг. ён не прымаў ніякіх канкрэтных крокаў у набліжэнні да Прагі. Пасля візіту польскага міністра прамысловасці і эканомікі Квяткоўскага ў сталіцу Чэхаславакіі з «добрымі намерамі», ён сустрэў халодную непрыязнасць з боку прэзідэнта Томаша Масарыка. Чэшскі лідэр лічыў галоўнымі парушальнікамі спакою ў Еўропе Венгрыю і «польскі калідор». Да таго ж, на яго думку, Польшча павінна была пайсці на ўступкі ў справе падтрымання міру [10, s. 121].

Першую спробу шматбаковага аналізу польскай гістарыяграфіі Мюнхенскага крызісу 1938 г. у 1960-я – 1990-я гг. зрабіў прафесар Кракаўскага універсітэта Г. Батоўскі [7, s. 267–309; 8]. Ён дастаткова глыбока прааналізаваў зборнікі дакументаў, выдадзеныя ў канцы 1930-х – 1950-х гадоў у Польшчы і Германіі, у якіх надрукаваны матэрыялы Мюнхенскай змовы, а таксама манаграфіі чэхаславацкіх палітыкаў Г. Рыпкі и К. Крофты аб гэтай падзеі, выдадзеныя ў Лондане і Празе ў 1939 г. Батоўскі падкрэсліваў, што бліжэйшы паплечнік Бенеша Губерт Рыпка пры аналізе крызісу 1938 г. робіць акцэнт на «нерашучасці і капітулянтскай палітыцы Чэхаславацкага ўрада перад заходнімі дзяржавамі з нагоды пагрозы біялагічнага знішчэння народа невялікай краіны» [15].

Гісторык Г. Батоўскі дае станоўчую ацэнку аналізу міжнароднай сітуацыі, зробленай Камілам Крофтай напярэдадні і ў перыяд Чэхаславацкага крызісу. Але ён даволі стрымана ацэньвае ўдзел ІІ Рэчы Паспалітай у падзеле Чэхаславацкай Рэспублікі (далей – ЧСР) – далучэнні Цешынскай вобласці да Польшчы, а таксама антысавецкай палітыкі яе ўрада. Між іншым, Г. Батоўскі падкрэслівае поспех нямецкага ўрада ў вырашэнні дыпламатычнымі сродкамі пытання нямецкай нацыянальнай меншасці ў памежнай краіне і паступовым далучэнні яе тэрыторыі да ІІІ Рэйха [7, s. 267–309].

Значны ўнёсак у распрацоўку Мюнхенскай праблематыкі на пачатку 1980-х гадоў зрабілі гісторыкі Е. Кажэньскі і Е. Красускі, прадстаўнікі навуковай школы Заходняга Пазнанскага Інстытута. Яны ажыццявілі сістэмны аналіз польскай і еўрапейскай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, што з'явілася прагрэсіўнай з'явай для тагачаснай гістарычнай навукі [11; 12; 13].

Е. Кажэньскі адзначаў, што Чэхаславакія як суб'ект міжнароднага права, Англіяй, Францыяй, Германіяй і Італіяй фактычна была пазбаўлена права ўдзелу ў Мюнхенскім дагаворы і толькі праінфармавана аб яго выніках без магчымасці пратэсту [11 12].

Такім чынам, гісторыкі лічаць еўрапейскія краіны прамымі саўдзельнікамі германскай агрэсіі супраць ЧСР і паступовай ліквідацыі яе дзяржаўнай незалежнасці ў сакавіку 1939 г. Кажэньскі не дае палітычнай ацэнкі далучэнню Цешынскага Шлёнска да Польшчы, якое адбывалася пры «дыпламатычным нейтралітэце» Германіі. Тым не меньш, ён падрабязна аналізуе мемуары Эдварда Бенеша, выдадзеныя ў Лондане і Празе ў пасляваенныя гады. Былы чэхаславацкі лідэр канстатуе аб'ектыўную немагчымасць прадухілення капітуляцыі краіны. Ён падкрэслівае «*здрадніцкую пазіцыю Польшчы*», якая канчаткова паслабіла безнадзейнае становішча Чэхаславакіі пасля адмовы ў праходзе савецкіх войскаў праз польскую тэрыторыю падкрэсліць, што польскія гісторыкі 1980-х – 2000-х гг. разглядаюць польска-чэхаславацкія адносіны ў кантэксце польска-нямецкіх стасункаў, дзе ІІ Рэчы Паспалитай адводзілася роля «сатэліта», паслухмянага палітычнага партнёра Германіі.

На падставе аналізу польскай гістарыяграфіі 1980-х – 2000-х гг. магчыма вызначыць наступныя напрамкі ў вывучэнні польскімі гісторыкамі прычын перадваеннага крызісу 1938 г. і вынікаў Мюнхенскага зговару:

– ігнараванне краінамі-ўдзельнікамі Мюнхенскага пагаднення міжнародна-прававых аспектаў, якія ў адпаведнасці з Версальскім, Сэн-Жэрменскім і Трыанонскім мірнымі дагаворамі (1918, 1919 г.), Лакарнскім дагаворам 1925 г. паміж Францыяй і Чэхаславакіяй, савецка-франка-чэхаславацкім дагаворам 1935 г. гарантавалася нерухомасць межаў Чэхаславакіі з суседнімі краінамі, яе нацыянальная незалежнасць і тэрытарыяльная цэльнасць як суб'екта міжнароднага права;

– ваенна-палітычныя аспекты, калі ў выніку агрэсіі альбо яе пагрозы былі прадугледжаны меры калектыўнай бяспекі з боку ўсіх членаў Лігі Нацый на падставе арт. 10, 11, 16 і 17 яе Статута;

Парыжскага пакта Брыана Келага ад 28 жніўня 1928 г., удзельнікі якога разам з Германіяй і Чэхаславакіяй адмаўляліся ў дапамоге СССР Чэхаславакіі (1925, 1935 г. з удзелам Францыі); Венгрыяй, Румыніяй і Югаславіяй (1920–1921 гг. – Малая Антанта і Польшчай);

– сацыяльна-эканамічныя аспекты, калі пасля далучэння тэрыторыі Чэхаславакіі насельніцтва Трэцяга Рэйха павялічылася больш чым на 7 млн. чалавек, і значна ўзраслі прамысловыя і ваенныя рэсурсы Германіі;

– этнанацыянальныя аспекты, калі ў адпаведнасці з канстытуцыяй Чехаславакіі 1920 г., гарантаваліся аднолькавыя правы і свабоды разам з чэхамі і славакамі ўсім нацыянальным меншасцям (немцам, венграм, русінам, палякам, румынам і інш.);

– тэрытарыяльныя аспекты, калі па выніках Мюнхенскай змовы II Рэч Паспалітая далучыла да сваёй тэрыторыі Цешынскую Сілезію з насельніцтвам 75 863 чалавек і вялікімі прамысловымі рэсурсамі [12];

– вывучэнне польскімі гісторыкамі на мяжы стагоддзяў расійскай гістарыяграфіі Мюнхенскай праблематыкі і ролі СССР ў вырашэнні пытання прадухілення нямецкай агрэсіі супраць Чэхаславакіі ў 1938 г. [5].

– Значны інтарэс для даследчыкаў польскай гістарыяграфіі 1980-х г. у вызначэнні месца Польшча як бастыёна паміж Еўропай і Савецкай Расіяй уяўляюць працы двух вучоных Заходняга Пазнанскага Інстытута прафесара М. Вайцэхоўскага [16] і доктара гісторыі М. Мрочкі [14].

У манаграфіі «Польска-нямецкія стасункі (1933–1938)» М. Вайцэхоўскі разглядае і аналізуе два этапы ў адносінах паміж краінамі: 1934–1935 гг. – перыяд польска-германскага супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай аснове; 1936–1939 гг. – калі ольшчы адводзілася роля «сатэліта», паслухмянага выканальніка ролі партнёра па палітычных справах. Падпісанне 26 студзеня 1934 г. польска-германскага пакта аб ненападзенні аўтар разглядае як вынік пераарыентацыі тактычнага курсу Веймарскай рэспублікі «з праціўніка Польшчы да яе саюзніка ў справах Германіі» [16, s. 15]. Гітлер планаваў, што Польшча апынецца ў ролі ваеннага саюзніка Германіі ў выпадку пахода на СССР. Для Польшчы галоўным пытаннем ў гэтай дамове было прызнанне Германіяй яе тэрытарыяльнага stus quo, а таксама статуса вольнага горада Гданьска і «польскага калідора».

Нельга пагадзіцца з меркаваннем М. Вайцэхоўскага на конт таго, што палякі «рашуча супраціўляліся» падзелу Чэхаславакіі і ліквідацыі яе дзяржаўнасці. Міністр замежных спраў Польшчы Ю. Бек неаднаразова падкрэсліваў у сваіх дыпламатычных прамовах, што Чэхаславакія – «гэта краіна, якая самастойна не можа вырашыць свае праблемы». Акрамя таго, ён адчуваў моцную асабістую непрыемнасць да чэхаславацкага прэм'ер-міністра Ю. Бенеша [9, s. 40]. Нарэшце, Польшча была вельмі зацікаўлена ў вырашэнні пытання аб далучэнні Цешынскай вобласці Чэхаславакіі, населенай палякамі, пасля плебісцыту аб яе аўтаноміі, дзякуючы «нейтралітэту» свайго суседа Германіі.

Неабходна адзначыць, што сучасныя польскія гісторыкі ў 2000-я гг. дастаткова негатыўна ацэньваюць меркаванне расійскіх калег наконт здрадніцкай палітыкі польскага ўрада ў Судэцкім крызісе. У значным сэнсе гэтаму спрыяла публікацыя ў 1981 г. Міністэрствам замежных спраў СССР зборніка дакументаў, прысвечаным падзеям напярэдадні Другой сусветнай вайны 1937–1939 гг. [3].

Да 70-годдзя падпісання Мюнхенскай дамовы на старонках расійскага электроннага выдання «Кто помогал Гитлеру в развязывании Второй мировой войны" ў 2008–2011 г. была разгорнута навуковая палеміка наконт прамых саўдзельнікаў у падзеле Чэхаславакіі паміж еўрапейскімі дэмакратыямі і Польшчай з Венгрыяй [4].

Такім чынам, пасіўна-прымірэнчая пазіцыя заходніх дэмакратый падчас Судэцкага крызісу, іх фактычная капітуляцыя ў Мюнхене і крах сістэмы «калектыўнай бяспекі» запэўнілі кіраўніцтва Трэцяга рэйха ў яго беспакаранасці і падштурхнулі да далейшых агрэсіўных крокаў. Ужо 21 кастрычніка 1938 г. Гітлер аддаў дырэктыву камандаванню вермахта па падрыхтоўцы да «ўладжвання пытання пакінутай Чэхіі» (Erledigung der Rest-Tschechei), на аснове ранейшага аператыўнага плана «Грюн».

Ажыццяўленне гэтага плана не прымусіла сябе доўга чакаць. Пры шырокай падтрымцы Германіі кіраўніцтва аўтаномнай Славакіі разгарнула сепаратысцкую дзейнасць і 14 сакавіка абвясціла незалежнасць, якая была ў той жа дзень прызнана Германіяй. 15 сакавіка 1939 г. часткі вермахта ўступілі ў Прагу у адпаведнасці з планам аперацыі «паўднёвы ўсход» (Unternehmen Südost). Дзяржаўная незалежнасць Чэхаславакіі была ліквідаваная, чэшскія землі пад назвай «пратэктарат Багемія і Маравія» фактычна ўвайшлі ў склад Трэцяга рэйха. Была спыненая спроба самавызначэння аўтаномнай раней у складзе Чэхаславакіі Карпацкай Украіны (Падкарпацкай Русі), якая абвясціла незалежнасць 15 сакавіка 1939 г. Яе тэрыторыя плошчай 4 657 кв. міль з насельніцтвам 694 тыс. чалавек была перададзена Венгрыі [4; 6].

Такім чынам, у выніку Мюнхенскай змовы 1938 г. пры непасрэдным і вызначальным удзеле вядучых еўрапейскіх дэмакратый былі груба зняважаны прынцыпы Лігі Нацый і цалкам разбурана

Версальская сістэма дзяржаўна-палітычнага складу Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, істотна павялічаны ваенны патэнцыял Трэцяга рэйха за кошт найбуйнейшага ў Еўропе ваенна-прамыслова комплексу заводаў Шкода і запасаў сучаснага ўзбраення Чэхаславакіі, зацверджаны яго статус арбітра і гегемона ў Цэнтральнай Еўропе і адкрыта свабодная дарога германскай ваенна-палітычнай экспансіі на ўсход [2].


1. Дрожжа, Л. Ч. Польска-савецка-германскія адносіны 1932–1939 гг. у польскай і беларускай гістарыяграфіі (1980–2000-я гг.) / Л. Ч. Дрожжа ; пад навук. рэд. У. Е. Снапкоўскага. – Мінск : БелНДІДАС, 2023. – 224 с.
2. Дрожжа, Л. Ч. Мюнхенскае пагадненне 1938 г.: урокі мінулага (гістарыяграфія пытання) / Л. Ч. Дрожжа // Труды БГТУ. Сер. 6. История, философия. – 2018. – № 1. – С. 62–67.
3. Документы и материалы кануна Второй мировой войны. 1937–1939 : в 2 т. – Т. 1 : ноябрь 1937 г. – дек. 1938 г. / М-во иностр. дел СССР ; редкол.: И. Н.Земсков [и др]. – М. : Политиздат, 1981. – 376 с.
4. Кто помогал Гитлеру в развязывании Второй мировой войны [Электронный ресурс] // Сегодня.ru. Информационно-аналитическое сетевое издание. – 11.10.2011. – Режим доступа: http://www.segodnia.ru/content/11746. – Дата доступа: 20.09.2021.
5. Мюнхенское соглашение 1938 года: история и современность : материалы Междунар. науч. конф., Москва, 15–16 октября 2008 г. – М. : Наука, 2009. – 429 с.
6. Рубцова, Е. В. Мюнхенское соглашение 1938 года и его последствия / Е. В. Рубцова, В. В. Лендич, Е. А. Прокопова // Научно-методический электронный журнал «Концепт». – 2016. – Т. 11. – С. 161–165.
7. Batowski, H. Kryzys dyplomatyczny w Europie jesień 1938 – wiosna 1939 / H. Batowski. – Warszawa, 1962. – S. 267–309.
8. Batowski, H. Sytuacja miedzynarodowa polski 1938–1939. Miedzy konferencja monachijska a wybuchem wojny / H. Batowski // Polska, Niemcy, Europa w 1939 r. : materialy sesji zorganizowanej w Uniwersytecie Jagiellonskim 14 grudnia 1989 r. z okazji 50 rocznicy wybuchu II wojny swiatowej / pod. red. Michala Pulaskiego. – Krak?w : Uniw. Jagiel, Prace Historyczne, Z. 99, 1991. – S. 17–29.
9. Beck, J. Ostatni raport / J. Beck / przedmowa M. Wojciechowski ; opracowanie, przypisy i indeks A. Skrzypek. – Warszawa : PWN, 1987. – 246 s.
10. Kaminski, M. K. W cieniu zagrozeni?. Polityka zagraniczna RP 1918–1939 / M. K. Kaminski, M. J. Zacharias. – Warszawa : Wyd. Głos, 1993. – 237 s.
11. Kozenski, J. Monachium 1938 w historiografii / J. Kozenski // Studia Historica Slavo-Germanica. – T. VIII. – Poznan : Uniw. im. Adama Mickiewicza w Poznaniu, Instytut Historii, 1979. – S. 161–179.
12. Kozenski, J. Czechoslowacka jesien 1938 r. / J. Kozenski. – Warszawa-Praga, 1984. – 378 s.
13. Krasuski, J. Miedzy wojnami. Polityka zagraniczna II Rzeczypospolitej / J. Krasuski. – Warszawa : PWN, 1985. – 215 s.
14. Mroczko, M. Polska mysl zachodnia (1918–1939) / M. Mroczko. – Poznan : Wyd-wo Inst. Zach., 1986. – 430 s.
15. Ripka, H. Munich. Befor and After / H. Ripka. – London, 1939. – 524 p.
16. Wojciechowski, M. Stosunki polsko-niemieckie 1933–1938 / M. Wojciechowski. – Wyd. II popr. – Poznan : Wyd. Istyt. Zach., 1980. – 277 s.



**Рахманова М.Э.**


## ИСТОРИОГРАФИЯ СОВЕТСКОЙ ПОЛИТИКИ ПРИНУДИТЕЛЬНОГО ПЕРЕСЕЛЕНИЯ В УЗБЕКИСТАН

С обретением Узбекистаном независимости, отношение к изучению всех проблем, считавшихся актуальными и сложными для области истории, изменилось в положительную сторону. Национальная политика, проводившаяся советской властью в 30–90-х годах XX века, и последствия насильственного переселения народов являются важными вопросами историографии Узбекистана. Жертвы этой этнической политики, насильственно проводимой в СССР, – около 6 миллионов жителей [7, с. 239], проживающих в приграничных районах и во внутренних районах страны, были лишены своих адресов проживания под влиянием политических репрессий и переведены в другие регионы страны, включая Узбекскую ССР.

Если корейцы, китайцы, поляки, немцы, турки-месхетинцы, хешмилы, курды, проживающие на своей родине, были насильственно перемещены в целях «обеспечения безопасности границ» [2], то крымские татары, чеченцы, болгары, карачаевцы, ингуши и представители ряда других этносов и наций были депортированы за короткий срок с обвинениями в «сговоре с врагом», «установлении шпионских связей», «противостоянии советскому государству» [9, с. 500].

Накануне Второй мировой войны и в годы войны узбекский народ смог показать примеры подлинной гуманности, гостеприимства и благородства по отношению к насильственно переселенным и «наказанным народам», несмотря на перенесенные лишения. Следует признать, что данная проблематика составляет основное содержание современных отечественных и зарубежных исторических исследований.

В научных исследованиях, проводимых историками советской эпохи и стран СНГ, авторы больше внимания уделяли общему процессу депортаций в тех регионах, из которых были переселены народы. Мало освещали их жизнь в регионах, куда шло переселение. Однако для того, чтобы всесторонне осветить историю депортаций, осуществленных в советском государстве, требуется специальное изучение этих вопросов [3, с. 61]. До и судьбы переселенцев на территории Узбекской ССР во время Второй мировой войны, их образ жизни, трудовая деятельность, взаимоотношения с местным населением, этнические особенности, вопросы благородства и толерантности узбекского народа – темы, требующие глубокого изучения. Ряд местных экспертов провели научные исследования по этим темам. Они проделали большую работу по изучению вышеуказанных актуальных